


# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

## ВЫПУСКУ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ВЫДАННЯЎ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ

## НА 2010 ГОД

Падпіска на выданні НББ у 2010 г. будзе ажыццяўляцца на дагаворнай аснове.

## Парадак заказу:

1. Запоўніце падпісныя дакументы:

- ЗАКАЗ на выданні НББ;
- два экзэмпляры ДАГАВОРА на выраб друкаваных і электронных выданняў.

2. Афармленыя дакументы высылайце на адрас:

*Выдавецкі аддзел,*
*Нацыянальная бібліятэка Беларусі,*
*прасп. Незалежнасці, 116,*
*220114, г. Мінск.*

Калі падпіску за бібліятэку аплачвае аддзел культуры выканкома, то дагавор павінен заключацца **паміж НББ і аддзелам культуры выканкома**.

Даведачныя тэлефоны выканаўцаў гл. на с. 11

Па пытаннях аплаты выданняў звяртайцеся па тэл.:
(+375-17) 293 25 76, 293 28 40.

## Набыць выданні Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі магчыма:

**ДУ «Нацыянальная бібліятэка Беларусі»**
Прасп. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск
Тэл.: (+375-17) 293 28 22, 293 28 13

**У кіёску НББ (за наяўны разлік)**
Тэл. (+375-17) 293 28 52

**РУП «Акадэмічная кніга»**
Прасп. Незалежнасці, 72, 220012, г. Мінск
Тэл./факс: (+375-17) 292 00 52, 292 46 52, 292 50 43

**ААТ «Белкніга»**
Вул. Чыгуначная, 27а, 220089, г. Мінск
Тэл./факс: (+375-17) 222 89 45, 222 89 51

# ЗМЕСТ

ДРУКАВАНЫЯ ВЫДАННІ ____ 4

ЭЛЕКТРОННЫЯ ВЫДАННІ ____ 9

Каляндарны план выхаду ў свет інфармацыйных выданняў НББ у 2010 г. ____ 11

**Дадаткі (укладышы):**

ЗАКАЗ на выданні НББ

ДАГАВОР на выраб друкаваных і электронных выданняў НББ

# Друкаваныя выданні

## 1. **Бібліятэчны веснік:** зборнік артыкулаў. Вып. 2

*Адказны за выпуск Алейнік М.Г.*

Штогадовы з працягам навукова-практычны зборнік «Бібліятэчны веснік» прысвечаны пытанням фарміравання сучаснай бібліятэчна-інфармацыйнай прасторы, перспектывам развіцця бібліятэк рэспублікі. Разглядаюцца праблемы заканадаўчай і нарматыўна-рэгламентуючай базы бібліятэчнай практыкі, фарміравання інфармацыйных рэсурсаў і асаблівасцей захоўвання фондаў, арганізацыі інфармацыйна-бібліятэчнага і сацыякультурнага абслугоўвання карыстальнікаў, выкарыстання сучасных тэхналогій у стварэнні інфармацыйнай прадукцыі, распрацоўкі комплексу інфармацыйна-тэхналагічных сістэм, арганізацыі, правядзення і каардынацыі навуковых даследаванняў, прафесіяналізацыі бібліятэчных кадраў Беларусі і г. д.

Зборнік карысны спецыялістам у галіне бібліятэчнай справы і інфармацыйных тэхналогій, выкладчыкаў, аспірантаў і магістрантаў, кіраўнікоў органаў упраўлення культуры.

200 стар. Цана 11 400 бел. руб.

## 2. **Грунвальдская бітва ў выявах**: па матэрыялах з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: камплект паштовак

*Адказны за выпуск Гарбачова Л.В.*

Камплект паштовак падрыхтаваны на аснове выяўленчых матэрыялаў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: гравюр, рэпрадукцый, ілюстрацый, прысвечаных самай вялікай бітве Сярэднявечча – бітве пад Грунвальдам, якая адбылася 15 ліпеня 1410 г.

У камплекце 16 паштовак Цана 9 200 бел. руб.

## 3. **Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі.** Вып. 12

*Адказны за выпуск Суша К.В.*




Зборнік навуковых артыкулаў з’яўляецца мнагапрофільным навуковым выданнем, што рэцэнзуецца, уключаным у Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па педагагічных навуках (бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства, кнігазнаўства), гістарычных навуках (дакументалістыка, дакументазнаўства, архівазнаўства) і культуралогіі.

У чарговым выпуску зборніка Нацыянальная бібліятэка Беларусі працягвае публікацыю матэрыялаў па праблемах вывучэння, захавання і выкарыстання дакументальнай спадчыны Беларусі, па гісторыі рукапіснай і друкаванай кнігі, архіўных дакументаў, бібліятэчнай справы, бібліяграфазнаўства, культуралогіі, падрыхтаваных беларускімі і замежнымі даследчыкамі кніжнай культуры. Раскрываюцца фонды рукапісаў, архіўных дакументаў, друкаванай кнігі, якія захоўваюцца ў бібліятэках, музеях, архівах Беларусі і замежжа. Уводзяцца ў навуковы абарот дакументы, факты і звесткі, звязаныя з гісторыяй кніжнай культуры Беларусі і іншых краін.

300 стар.  Цана 11 500 бел. руб.

## 4. **Материалы VI Международных книговедческих чтений «Библиотеки в формировании инновационной среды для развития науки, образования и бизнеса»**

*Ответственный за выпуск Суша А.А.*




Сборник состоит из текстов выступлений участников VI Международных книговедческих чтений «Библиотеки в формировании инновационной среды для развития науки, образования и бизнеса», которые в ноябре 2010 г. будет проводить Национальная библиотека Беларуси.

Содержит доклады и сообщения по наиболее актуальным проблемам библиотечного дела, вопросам повышения эффективности деятельности библиотек в обеспечении инновационного развития общества.

300 стр. Цена 15 200 бел. руб.

## 5. **Национальная библиотека Беларуси**: учебное пособие

*Ответственный за выпуск Кирюхина Л.Г.*




Автор пособия – директор Национальной библиотеки Беларуси, доктор педагогических наук, профессор Мотульский Р.С. знакомит читателя с богатейшими информационными ресурсами, которыми располагает главная библиотека страны – республиканский и социокультурный центр. В пособии впервые комплексно и многоаспектно рассмотрена электронная библиотека, формируемая НББ, а также особенности организации обслуживания пользователей, социокультурная, научно-исследовательская, научно-методическая, международная и издательская деятельность НББ, ее организационно-управленческая структура. Значительное внимание в пособии уделено архитектурно-строительным и информационно-технологическим характеристикам нового здания, не имеющего аналогов в мире. Издание будет интересно не только специалистам библиотечного дела, но и исследователям национальной культуры Беларуси, студентам и учащимся высших и средних специальных учебных заведений, слушателям курсов переподготовки и повышения квалификации.

136 стр. Цена 9 500 бел. руб.

## 6. Нацыянальны дакумент як аб'ект дзейнасці бібліятэк Беларусі: зборнік артыкулаў

*Складальнік Кузьмініч Т.В.*

У выданні разгледжаны нацыянальны дакумент як культурная каштоўнасць Беларусі, якая адлюстроўвае дасягненні айчыннай навукі, вытворчасці, адукацыі, мастацтва, узровень выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці. Абагульнены вопыт навуковых бібліятэк краіны па фарміраванні асобных калекцый нацыянальных дакументаў, намаганні па іх захаванні, рэстаўрацыі і кансервацыі. Паказаны таксама асаблівасці бібліяграфічнай апрацоўкі нацыянальных дакументаў, фарміравання даведачна-пошукавага апарату, алгарытмы атрымання электронных копій асобных відаў нацыянальных дакументаў і стварэння на іх аснове паўнатэкставых баз даных.

180 стар. Цана 11 300 бел. руб.

## 7. Новыя кнігі: па старонках беларускага друку*

*Адказны за выпуск Прадзеіна А.В.*




Бюлетэнь «Новыя кнігі» аператыўна дае інфармацыю аб найбольш значных навінках беларускага друку, змяшчае тэматычныя і персанальныя бібліяграфічныя спісы-дадаткі. Складаецца з двух раздзелаў – «Навінкі беларускага друку» і «У полі зроку рэцэнзента», якія інфармуюць аб новых кнігах беларускіх выдавецтваў, найбольш значных артыкулах з беларускай перыёдыкі і рэцэнзіях на беларускія выданні, якія паступілі ў фонд Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Значна дапаўняюць бюлетэнь дадаткі, якія выходзяць пад адной вокладкай з выданнем. У іх публікуюцца бібліяграфічныя спісы па пытаннях гісторыі і сучаснага развіцця Беларусі; штогадовая фактаграфічная інфармацыя «Беларускі каляндар, … год»; матэрыялы да юбілейных дат знакамітых дзеячаў краіны, шэрагу арганізацый, устаноў і прадпрыемстваў, якія ўнеслі значны ўклад у

* Падпіска на часопіс праводзіцца па каталогу Белпошты 2009 г. «Газеты и журналы Республики Беларусь». Індэксы выдання – 74972, 749722.

развіццё эканомікі, культуры, навукі і асветы рэспублікі, да значных гістарычных падзей; дапаможныя паказальнікі да раздзела «Навінкі беларускага друку».

Выданне прызначана ў дапамогу работнікам бібліятэк і іншых культурна-асветных устаноў, выкладчыкам, студэнтам, школьнікам, усім, хто цікавіцца гісторыяй і культурай Беларусі, хто хоча штомесячна атрымліваць інфармацыю для павышэння агульнай і прафесійнай адукацыі, самаадукацыі і дасугавай дзейнасці.

*Тэмы дадаткаў на 2010 г.:*

№ 1. Даты беларускага календара (сакавік 2010 г.).
№ 2. Даты беларускага календара (красавік – чэрвень 2010 г.).
№ 3. «Да 65-годдзя Вялікай Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне».
№ 4. Даты беларускага календара (ліпень – жнівень 2010 г.).
№ 5. Даты беларускага календара (верасень – кастрычнік 2010 г.).
№ 6. «Новыя кнігі»: да 50-годдзя з часу выхаду першага нумара. Бібліятэкі – юбіляры 2010 года.
№ 7. «Да 520-годдзя з дня нараджэння мысліцеля-асветніка, гуманіста і першадрукара Ф. Скарыны».
№ 8. «Беларускі каляндар, 2011 год». Частка 1.
№ 9. «Беларускі каляндар, 2011 год». Частка 2.
№ 10. Даты беларускага календара (лістапад – снежань 2010 г.; студзень – люты 2011 г.).
№ 11. «Экалагічная адукацыя і выхаванне вучняў у агульнаадукацыйных установах Рэспублікі Беларусь».
№ 12. Дапаможныя паказальнікі да раздзела «Навінкі беларускага друку».

## 8. **Разработка и внедрение виртуальных сервисов:** методическое пособие

*Составитель Долгополова Е.Е.*

В пособии рассматриваются организационно-технологические аспекты разработки и внедрения виртуальных сервисов в библиотеках, приводятся список рекомендуемой литературы, перечень бесплатных пакетов прикладных программ, которые могут использоваться для разработки виртуальных сервисов.

Пособие представляет интерес для руководителей библиотек, специалистов, работающих в сфере обслуживания пользователей и автоматизации библиотечных процессов.

52 стр. Цена 5000 бел. руб.

# Электронныя выданні

## 9. Беларускі каляндар, 2011 год

*Адказны за выпуск Прадзеіна А.В.*

Электроннае выданне змяшчае інфармацыю аб найбольш значных знамянальных і памятных датах, якія будуць адзначацца ў нашай краіне ў 2011 г. Даведачная інфармацыя да некаторых дат дапоўнена алічбаванай партрэтнай галерэяй дзеячаў-юбіляраў, выявамі помнікаў, гербаў, фотаздымкамі ўстаноў, гіперспасылкамі на інтэрнэт-рэсурсы.

Для зручнасці выкарыстання календара прадугледжаны пошук па персаналіях, аб'ектах, падзеях, рэгіёнах.

Выданне прызначана ў дапамогу бібліятэкарам, работнікам музеяў і сродкаў масавай інфармацыі, выкладчыкам, студэнтам, навучэнцам, а таксама ўсім, хто цікавіцца мінулым і сучасным Беларусі.

Каляндар падрыхтаваны на аснове базы даных «Беларусь у асобах і падзеях» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Інфармацыя прадстаўлена ў pdf-фармаце.

Аб'ём 25 Мб. Цана 9000 бел. руб.

## 10. Спадчына акадэміка Яўхіма Карскага: да 150-годдзя з дня нараджэння

*Адказны за выпуск Суша К.В.*

Электроннае выданне прысвечана 150-годдзю з дня нараджэння Яўфімія Фёдаравіча Карскага (1861–1931) – выдатнага беларускага вучонага, этнографа, фалькларыста, палеографа, заснавальніка беларускага навуковага мовазнаўства і літаратуразнаўства, удзельніка беларускага нацыянальнага руху, плённага дзеяча на ніве асветы і культуры беларускага народа.

Уключае біяграфічны нарыс, бібліяграфію твораў, матэрыялы па гісторыі асабістай бібліятэкі Я.Ф. Карскага, бібліяграфічны спіс публікацый аб яго жыцці і творчай дзейнасці, электронныя копіі рукапіснага каталога бібліятэкі Я.Ф. Карскага, архіўных дакументаў і рэдкіх выданняў яго твораў з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

Аб'ём 1,5 Гб. Цана 18 300 бел. руб.

## 11. Паклонімся вялікім тым гадам: 65-годдзю Вялікай Перамогі прысвячаецца

*Адказны за выпуск Прадзеіна А.В.*

Электроннае выданне прысвечана 65-годдзю Вялікай Перамогі і прадстаўляе бібліяграфічную інфармацыю, электронныя копіі выданняў падпольнага і партызанскага друку, гуказапісы песень ваенных гадоў.

Аб'ём 3,2 Гб. Цана 23 700 бел. руб.

## КАЛЯНДАРНЫ ПЛАН
## выхаду ў свет інфармацыйных выданняў НББ у 2010 г.

| № п/т | Выданне | Адказны за выпуск | Тэлефон | Выхад у свет |
|---|---|---|---|---|
| | *ДРУКАВАНЫЯ* | | | |
| 1 | Бібліятэчны веснік: зборнік артыкулаў. Вып. 2 | Алейнік М.Г. | 266 37 70<br>293 27 61 | Снежань |
| 2 | Грунвальдская бітва ў выявах: з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: камплект паштовак | Гарбачова Л.В. | 293 27 19 | Чэрвень |
| 3 | Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 12 | Суша К.В. | 293 27 83 | Ліпень |
| 4 | Материалы VI Международных книговедческих чтений «Библиотеки в формировании инновационной среды для развития науки, образования и бизнеса» | Суша А.А. | 266 37 07<br>293 28 02 | Лістапад |
| 5 | Национальная библиотека Беларуси: учебное пособие | Кірухіна Л.Г. | 266 37 04<br>293 25 03 | Люты |
| 6 | Нацыянальны дакумент як аб'ект дзейнасці бібліятэк Беларусі: зборнік артыкулаў | Кузьмініч Т.В. | 266 37 29<br>293 25 06 | Сакавік |
| 7 | Новыя кнігі: па старонках беларускага друку | Прадзеіна А.В. | 293 28 26 | Кожны месяц |
| 8 | Разработка и внедрение виртуальных сервисов: методическое пособие | Далгаполава А.Е. | 266 37 17<br>293 25 07 | Май |
| | *ЭЛЕКТРОННЫЯ* | | | |
| 9 | Беларускі каляндар, 2011 год | Прадзеіна А.В. | 293 28 26 | Ліпень |
| 10 | Спадчына акадэміка Яўхіма Карскага: да 150-годдзя з дня нараджэння | Суша К.В. | 293 27 83 | Снежань |
| 11 | Паклонімся вялікім тым гадам: 65-годдзю Вялікай Перамогі прысвячаецца | Прадзеіна А.В. | 293 28 26 | Май |

## Таксама прапануем набыць выданні па «Тэматычнаму плану выпуску інфармацыйных выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі на 2009 год»

### ДРУКАВАНЫЯ ВЫДАННІ

Бібліятэчны веснік: зборнік артыкулаў. Вып. 1
Библиотеки Беларуси: справочник
Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 11
Материалы V Международных книговедческих чтений «Электронные библиотеки в ликвидации информационного неравенства»
Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі платных паслуг у бібліятэках
Нацыянальная бібліятэка Беларусі = Национальная библиотека Беларуси: рэкламнае выданне
Организация обслуживания пользователей: из опыта Национальной библиотеки Беларуси
Рарытэты з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: камплект паштовак

### ЭЛЕКТРОННЫЯ ВЫДАННІ

Актуальныя праблемы культуры і мастацтва. 2009 г. Вып. 1–4
Беларускі каляндар, 2010 год
Библиотека Хрептовичей
Запаветны напеў, запаветная даль… Белавежская пушча
Інфармацыйная прадукцыя навуковых бібліятэк і Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі на 2009 г.
«Не пакідайце ж мовы нашай беларускай…»: да 170-годдзя з дня нараджэння Францішка Багушэвіча (1840–1900)
Падпольны і партызанскі друк Беларусі
«Radziviliana»: дакументальныя помнікі з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: іканаграфія Радзівілаў

## Таксама прапануем набыць выданні па «Тэматычнаму плану выпуску інфармацыйных выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі на 2008 год»

### ДРУКАВАНЫЯ ВЫДАННІ

Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Вып. 10
Мастацтва беларускай старадрукаванай кнігі: Куцеінская друкарня XVII ст.: камплект паштовак
Мастацтва рукапіснай кнігі: Пакуты Хрыстовы: Рукапіс XIX ст.: камплект паштовак
Мастацтва еўрапейскіх старадрукаў: Французская ілюстрацыя XVIII ст.: камплект паштовак
Матэрыялы Чацвёртых Міжнародных Кнігазнаўчых чытанняў «Дакументальныя помнікі ў сучасным інфармацыйным грамадстве»
I Міжнародны фестываль пейзажа: прысвечаны творчасці Віталя Цвіркі: каталог выстаўкі
Нацыянальная бібліятэка Беларусі: камплект фотапаштовак
Топографические примечания на знатнейшие места путешествия Ее Императорского Величества в белорусские наместничества: факсимильное издание, Санкт-Петербург, 1780

### ЭЛЕКТРОННЫЯ ВЫДАННІ

Актуальныя праблемы культуры і мастацтва. 2008 г.: інфармацыйна-аналітычны зборнік
Асноўныя службовыя дакументы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. 2007 г.
Беларускі каляндар, 2009 год
Библиотеки агрогородков как объект «Государственной программы возрождения и развития села на 2005–2010 гг.»
«Восток – Запад в век информационно-телекоммуникационных технологий»: материалы Международной конференции по межбиблиотечному абонементу и доставке документов (3–7 декабря 2007 г., Минск)
Інфармацыйная прадукцыя навуковых бібліятэк і Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі на 2008 г.
Имидж-каталог Национальной библиотеки Беларуси
Нацыянальная бібліятэка Беларусі = Национальная библиотека Беларуси
Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў друку. 1922–2007 гг.
Нормативно-правовое обеспечение деятельности библиотек
«Жыве паміж намі дудар наш…»: да 200-годдзя з дня нараджэння Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (1808–1884)
«Radziviliana»: дакументальныя помнікі з фондаў НББ

ЛИ № 02330/0552578 ад 01.10.2009.

Тыраж  250 экз. Заказ 141.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
дзяржаўная ўстанова “Нацыянальная бібліятэка Беларусі”.

Прасп. Незалежнасці, 116, 220114, г. Мінск.
Тэл. 293 28 22.